УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«МІНСКІ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ»

З.Б. Варановіч, А.У. Жардзецкая

# Беларуская мова і літаратура

*Метады і прыёмы развіцця творчых здольнасцей студэнтаў*

Мінск
Выд-ва МІК
2004

Scanned by CamScanner

УДК 808.26
ББК 81.2
В 18

Рэцэнзент:

**В.А. Максімовіч**, доктар філалагічных навук, прарэктар па выхаваўчай рабоце Акадэміі мастацтваў Рэспублікі Беларусь

**Варановіч, З. Б.**

**В 18** Беларуская мова і літаратура. Метады і прыёмы развіцця творчых здольнасцей студэнтаў / З.Б. Варановіч, А.У. Жардзецкая. – Мн.: Выд-ва МІК, 2004. – 36 с.

ISBN 985-6746-20-5

Разглядаюцца метады і прыемы, якія ў працэсе вывучання беларускай мовы і літаратуры накіроўваюць студэнтаў на творчасць і пошукавасць, актывізуюць іх думкі, вучаць моладзь разважаць, супастаўляць, самастойна прыходзіць да пэўных высноў.

Дапаможнік адрасаваны студэнтам дзённай і завочнай форм навучання.

УДК 808.26
ББК 81.2

ISBN 985-6746-20-5

© З.Б. Варановіч, А.У.Жардзецкая, 2004
© МІК, 2004

Scanned by CamScanner

## Змест

Прадмова .......... 4

Метады і прыёмы навучання роднай мове і літаратуры .......... 5

Класіфікацыя метадаў і прыёмаў навучання .......... 6

Работа з даведачнай літаратурай .......... 12

Аналіз і сінтэз .......... 18

Лінгвістычны эксперымент .......... 19

Удасканаленне метадаў і прыёмаў навучання .......... 20

Літаратура .......... 35



Scanned by CamScanner

# Прадмова

Вашай увазе прапануецца метадычны дапаможнік па развіцці творчых здольнасцей студэнтаў на занятках беларускай мовы і літаратуры.

"Справа выкладання – мастацтва", – вось стрыжнявы тэзіс створанай Коласам метадычнай сістэмы. Гэта таксама вызначальны прынцып і сучаснага навучання мове і літаратуры.

Сёння шмат трэба зразумець, асэнсаваць, ацаніць па-новаму. У нашым грамадстве ідзе актыўны працэс пераацэнкі шматлікіх высноў мовы, літаратуры, гісторыі; адмаўленне ад звыклых педагагічных штампаў, схем, дагматычнага мыслення. Побач з паглыбленнем цікавасці да нацыянальных карэнняў выразна намеціўся зварот да агульначалавечых каштоўнасцей. Усё гэта патрабуе значных змен у працэсе навучання роднай мове. Не проста ўдасканаліць змест, формы, метады і сродкі навучання, а карэнным чынам перабудаваць тэхналогію навучальнага працэсу, пераарыентаваць яго на аснове новых канцэптуальных падыходаў.

Надзвычай востра сёння стаіць пытанне аб неабходнасці выхавання ў студэнтаў нацыянальнага менталітэту, пачуцця патрыятызму, далучанасці да гісторыі свайго народа, яго культуры, мовы. Родная мова, як вядома, тая ўрадлівая глеба, на якой фарміруецца чалавек, якая ўвабрала ў сябе назапашаны народам стагоддзямі жыццёвы вытворчы і маральны вопыт. Нездарма кажуць: няма мовы – няма народа. Роднай мове, безумоўна, належыць вядучая роля ў прафесійнай падрыхтоўцы нацыянальных кадраў.

Сёння значна вырасла выхаваўчая функцыя вышэйшай і сярэдняй школы ўвогуле. Выхаванне ў моладзі любові і павагі да роднай мовы, выхаванне сродкамі мовы высокіх грамадзянскіх пачуццяў набывае асаблівае значэнне. Адукацыйнае і выхаваўчае значэнне роднай мовы неаднойчы падкрэслівалі заснавальнікі методыкі рускай і беларускай моў. Так, Ф.І. Буслаеў пісаў: "Родная мова так зраслася з асобай кожнага, што вучыць мове – значыць разам развіваць духоўныя здольнасці вучняў."[1]

Якуб Колас – народны пісьменнік Беларусі, а таксама педагог, аўтар першай методыкі пачатковага навучання беларускай мове, роднае слова лічыў той крыніцай, з якой пазнаецца жыццё, навакольны свет, таму што гэта – крыніца адукацыі, чалавечага розуму і, што вельмі важна, – пачуццяў. Чужую мову можна вывучыць і нават думаць на ёй, а вось адчуваць – толькі на роднай.

Улічваючы гэта, метадысты вылучаюць не толькі бліжэйшую задачу, накіраваную на засваенне і практычнае прымяненне навуковых асноў вывучаемага прадмета, але адзначаюць больш шырокую задачу – фарміраванне асобы, чым абумоўліваецца месца беларускай мовы ў сістэме

[1] Буслаев Ф.И. О преподовании отечественного языка. Л., 1941.



Scanned by CamScanner

іншых вучэбных прадметаў. Таму надзвычай важна, каб наша моладзь не толькі грунтоўна ведала, але і па-сапраўднаму палюбіла родную мову, каб яна тонка адчувала і багацце, і мілагучнасць, і трапнасць беларускага слова, каб праз яго глыбей спасцігала саму душу свайго народа.

Коласаўскія погляды на выхаванне, на выкладанне роднай мовы і літаратуры, як вядома, увасоблены ў трылогіі "На ростанях", "Другім чытанні для дзяцей беларусаў", "Метадыцы роднай мовы".

Важнейшую ролю выкладчыка вялікі педагог бачыў у развіцці пазнавальных інтарэсаў маладога пакалення. Ён быў цвёрда перакананы ў тым, што веды не павінны давацца моладзі ў гатовым выглядзе. У цэнтр увагі Якуб Колас ставіў выхаванне творчай асобы. Вялікую ролю ў гэтым ён надаваў правільнаму выбару таго ці іншага метада ў працэсе навучання.

Што датычыць метадаў (грэч. слова "метад" азначае шлях, спосаб пазнавальнай і практычнай дзейнасці людзей), то яны падзяляюцца на метады даследавання і метады навучання.

У даным вучэбным дапаможніку падрабязна разглядаюцца метады навучання.

## Метады і прыёмы навучання роднай мове і літаратуры

Кожны метад мае сваю ўнутраную структуру, складаецца з мноства прыёмаў, якія выступаюць як яго часткі.

**Прыёмы** – гэта "дэталі метаду, яго элементы, састаўныя часткі і асобныя крокі ў той пазнавальнай рабоце, якая адбываецца пры ўжыванні данага метаду".[1] Яны не маюць самастойнай вучэбнай задачы, а падпарадкоўваюцца той задачы, рашэнне якой дасягаецца пэўным метадам. Напрыклад, даць студэнтам паняцце аб вытворнай аснове – гэта вучэбная задача. Яна можа быць ажыццёўлена любым метадам: шляхам вуснага тлумачэння настаўніка, гутаркі з аудыторыяй ці самастойнай работы студэнтаў, у працэсе якой яны самі здабываюць неабходныя веды. Але ў любым выпадку, каб студэнты зразумелі, што такое вытворная аснова, неабходна звярнуцца да марфемнага аналізу слоў, супастаўлення розных асноў, ужыць графічную нагляднасць, зрабіць неабходныя абагульненні. Усе гэтыя вучэбныя дзеянні і з'яўляюцца метадычнымі прыёмамі.

---

[1] Основы дидактики/ Под ред. Б. П. Есипова. М., 1967. С. 239.



Scanned by CamScanner

# Літаратура


1. Міцкевіч К.М. (Якуб Колас). Методыка роднае мовы. – Зб. тв.: У 14 т. Т. 12. – Мн.: Мастацкая. літ., 1976.

2. Барановіч З.Б. Методыка выкладання беларускай мовы: (Вучэбны дапаможнік для філал. фак. ун-таў). – Мн.: Выд-ва "Універсітэцкае", 1990.

3. Барановіч З.Б. Да методыкі – з павагай // Адукацыя і выхаванне. 1994. №1.

4. Барановіч З.Б., Гамеза Л.М., Крылова С.І. і інш. Практыкум па методыцы выкладання беларускай мовы. У 2 ч. Ч. 1. – Мн., 1998.

5. Раманцэвіч В.К., Танана У.М. Беларуская мова // Дапаможнік для вайскоўцаў. – Мн., 1993.

6. Якуб Колас: Праблемы сярэдняй і вышэйшай школы // Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі, прысвечанай 110-й гадавіне з дня нараджэння Якуба Коласа. – Мн., 1992.

7. Гілевіч Н.І., Ляшук В.М. Стылістыка і культура маўлення. Метад. рэкамендацыі і тэксты. – Мн., 1998.

8. Яфімава М.Б. Зямля бацькоў, зямля святая. – Мн., 1997.




Scanned by CamScanner